Цэна асобнаго нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністраціі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспацэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна также падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей,, хто ня захоча каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія толькі для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 23 Кастрычніка 1914 г. № 42

## Цьверць году вайны.

Цьверць году крывавых змаганьнёў паміж мільёнамі! Сто дзён без мала ліецца чэлавечая цёплая кроў. Сто дзён кладуцца покатам без часу тысячы нябошчыкоў ды з дымам пажароў ідуць сялібы і ў поце запрацаванае дабро людзкое. Сто дзён на пабоішчах над трупамі лунаюць груганы ды ваўкі выюць. Паміж трупамі сьцікаюцца-сочуць маці і жонка з дзіцём:—сына, мужа ды бацькі шукаюць! Шал нейкі апанаваў усю Эўропу. Уваружэны мір-супакой здрадзіў яе. Людзі захлёбываюцца у сваей-жэ сьвянцонай крыві і гінуць у вогнішчах сваімі-ж рукамі распаленых...

Разважаючы трох-месячные барацьбы дзевяці многомільённых народоў бачым. што бітвы ішлі і ідуць не на жарты. Пасьля асілкавых на жыцьцё і сьмерць змаганьнёў. Бэльгія здалася; нямецкае войска загарнуло амаль ня ўсю гэту гэроічную старонку, а бэльгійскае войска злучылася с француским і англіцкім. На французкай граніцы бітвы французоў, англічан і бэльгійцоў з немцамі не спыняюцца, і вялікай перэвагі на тую ці іншую старану не відаць. Тры пабеданосные с пачатку паходы аўстрыякоў і немцоў у граніцы Расеі не ўдаліся. Першы паход—гэта аўстрыякоў у люблінскую і ломжынскую губ. — расейцы ня толькі адбілі, але ешчэ самі заваевалі у Аўстрыі амаль ня ўсю Галіччыну. Другі паход—нямецкі—у сувальскую і ломжынскую губ. так сама не пашэнціў: каля Нёмана расейскае войска змусіло немцоў атступіць да сваіх граніцоў. Трэці паход нямецкі—на Варшаву—расейцы спынілі, перэмаглі нямецкае войска і цяперака атпіраюць яго назад, к Нямеччыне, адбіраючы па дарозе захопленые немцамі польскіе гарады і сялібы. Сэрбы і чорнагорцы далей змагаюцца з Аўстрыей. Японцы бомбардуюць Ціндао, у якім немцы ешчэ трымаюцца, На моры і ў паветры так сама ідуць бітвы: пайшло за гэты час на дно мораў і акіяноў не мала караблёў і людзей, і не мала с-пад воблакоў на зямлю грымнулася самалётоў і лятуноў. Урэшці, да дзевяці ваюючых дзержавоў прылучылася апошнімі днямі і дзесятая—Турэччына. Па загаду немцоў туркі рынуліся ў бітву, бадай для сябе ня роўную. У даўнейшых войнах Расеі с Турэччынай за апошнюю часта-густа заступаліся Англія і інш Цяпер-жэ Англія—хаўрусніца.. Расеі.

І вось, як бачым, сьветавая вайна не зьменшаецца а павялічываецца Што дала яна ваюючым народам—пакуль-што падлічыць немагчыма. Адно ведаем. што Бэльгія, Галіччына, Польшча і часьць Літвы заліты крывёй, засеяны трупамі і засыпаны попелам спаленых ворагам сялібоў. Скарыстаў з гэтаго хіба толькі які злодзей-марадзёр, злупіўшый з забітаго ваякі апошнюю вопратку.

Тые варожбы перэд вайной, што вайна доўга не працягніцца, разьвеяліся, як дым. Канца праліваньню крыві не відаць. Цяпер некаторые кажуць, што не пазьней восені будучаго году прыйдзе замірэньне. Ці толькі прыйдзе? Кроў ап'яняець людзей.

Астаецца толькі адно—гэта верыць, што пасьля кожнай вялікай буры-навальніцы, заўсёды наступае доўгая сонечная пагода.

**К—а.**

# ВАЙНА.

## Найвышэйшы маніфэст.

Божай міласьцю Мы, Мікалай Другі, Імпэратар і Самадзержэц Усерасейскі, Цар Польскі, Вялікі Князь Фінляндзкі і інш. і інш. і інш., абвешчаем ўсім верным нашым падданым. што ў неўдачнай дагэтуль барацьбе з Расеяй, стараючыся ўсімі спосабамі павялічыць свае сілы, Нямеччына і Аўстра-Вэнгрыя дамагліся, падмогі турэцкаго ураду і уцягнулі у вайну з намі асьляплёную імі Турэччыну. Турэцкі флот пад кіраваньнем немцоў адважыўся вераломна напасьці на нашэ Чорнаморскае пабярэжжэ. Адразу пасьля гэтаго загадалі Мы расейскаму послу у Царэградзе з ўсімі чынамі пасольскімі і консульскімі пакінуць граніцы Турэччыны. С поўнай супакойнасьцю і спадзеваньнем на падмогу Божэю прымець Расея гэты новы проціў яе выступ старога прыцісьніцеля хрысьціянскай веры і ўсіх славянскіх народоў. Ня першыня адважнаму расейскаму аружжу перэмагаць турэцкіе полчышчы. Пакараець яно і на гэты раз зухвалаго ворага нашай бацькоўшчыны. Разам з ўсім народам расейскім Мы безупынне верым, што цяперашняе неразумнае умешываньнеся Турэччыны у ваенные змаганьня толькі прысьпяшыць немінучы для яе ход збываньнёў і аткрыець Расеі дарогу к развязаньню перэказаных ей прашчурамі гістарычных загадоў на берагох Чорнаго мора.

Дадзены у Царскім Сяле у двацацаты дзень кастрычніка у лета ад Нараджэньня Хрыстова тысяча дзевяцьсот чатырнацатае, панаваньня жэ Нашаго у двадцатае. На подлініку ўласнай рукою Гасудара Імпэратара падпісана:

«МІКАЛАЙ».

21 кастрычніка Гасудар Імпэратар выехаў с Царскаго Села к дзействуючэй арміі.

### Расейска-Турэцкая.

Пасьля нападу, 16-го кастрычніка, турэцкаго флоту на Чорнаморскае паберэжжэ (на г.г. Феодосію, Адэсу, Новаросійск, Севастополь), расейскі урад заявіў Турэччыне аб разрыве дыплёматычных стасункоў і атклікаў с Константынополя свае пасольскіе і консульскіе установы, якіе пакінулі Турэччыну18 кастрычніка. 20 кастрычніка выехало с Петрограду турэцкае пасольство. У афіціальным турэцкім абвешчэньні гаворыцца, што ў той час, як турэцкая ескадра рабіла манэўры на Чорным моры, яна была раптоўна атакавана расейскім флотам, што і змусіло Турэччыну выступіць проці Расеі. Каўказкай расейскай арміі такі дадзены надовічы прыказ: «16 кастрычніка туркі вероломна напалі на нашы прыбярэжные месты і караблі чорнаморскаго флоту. Найвышэй загадано лічыць, што Расея у вайне с Турэччынай, а войску даверэнай мне Каўказкай арміі перайці граніцу і атакаваць турак. *Генерал ад'ютант граф Воронцов-Дашков*». Паміж Адэсай і Константынополем перэрваны кабэль (марскі тэлеграф), і цяпер між гэтымі гарадамі зносіны па тэлеграфу спыніліся.

### Расейска-Аўстрыяцкая.

Заўзятая і крывавая барацьба у Галіччыне на цэлым фронце і каля Турка не спынялася праз гэты увесь тыдзень, не нрыносючы вялікіх рэзультатоў ні аднэй ні другой ваюючэй старане. На паўдня ад Перамышля расейцы у некаторых мейсцах пасуnуліся наперад. Нямі ізноў узята у палон 10 афіцэроў і 500 непрыяцельскіх салдатоў. На Сане каля Лезахова адзін з нашых пяхотных паўкоў дасьцігнуў непрыяцельскіх акопоў, урваўся ў іх і, карыстаючы з запанаваўшаго у астрыякоў перэпалоху, заўладаў штурмам адным з блізка распаложэных фортоў (укрепленьнеў). Пры гэтым расейцамі узята у палон 5 афіцэроў, 500 салдатоў і захоплены кулемёты. На левым берազе Сана расейскае войска урвалося ў вёску Нізко і завязалася ў гэтым раёне заўзятая бітва. 21 кастрычніка. На ніжнім Сане расейскае войска далей перэпраўляецца на левы берэг рэкі пры гэтым заўладало вёскай Мальцэ і часткай умацаванай пазыціі паўночней ад Развалова, захапіўшы тут дзьве гарматы і кулемёты. У раёне Нізко ідзе крывавая барацьба, прычым намі захоплена тут каля 2500 палонных.

### Расейска Нямецкая.

Пачаўшаеся атступаньне немцоў с пад Варшавы і інш. мейсцоў Польшчы не спынялося праз увесь тыдзень; расейскае войска напірало, а нямецкае—атступало, пры гэтым расейцы ізноў адзін за адным займалі за Віслай польскіе гарады, забраные ўперад немцамі. Гэтак, перайшлі у расейскіе рукі гарады і мястэчкі Гостынін, Опочно, Стрыков, Ежов, Островец, Ожаров, Петроков і інш. На граніцы Усходней Прусіі крывавые бітвы не спыняліся. Немцы тут заўзята наступалі каля Бакалажэва, але ўсе атакі іх былі адбіты расейцамі, і немцы шмат панесьлі страт, так што ў некаторых мейсцох груды трупоў заміналі стрэляць. Апошнім часам атакі нямецкіе прыціхлі і расейцы пасунуліся наперад у раёне Владыслаўов—Ромінтэнскі лес. Усюдах пры атступленьні немцоў расейцы захапілі шмат палонных і ўсэлякай ваеннай здабычы. 21 кастрычніка. На ўсходне-пруским фронце немцы усюдах перайшлі к абароне, а расейскае войска у некаторых мейсцох пасунулося наперад. За Віслай, на поўнача-захад ад Піліцы расейскае войска без важнейшых бітвоў пасунулося наперад, заняўшы Шарэк, Ласк і Распжу. На фронце Радошыцэ—Кельцы праціўнік атходзіць у напрамку на Влошчову і Андржэев. На паўдня-ўсход ад Кельцоў аўстрыякі мецілісяе аказаць болей упорнае сапраціўленьне, але на вялікшай часьці фронту аткінуты, пакінуўшы 3 гарматы, 5 кулемётоў і каля 1500 палонных. Трымаюцца ешчэ толькі у ніжнім цячэньні р. Опатовкі.

### Французска-Англіцка-Бэльгійска-Нямецкая.

Крывавые змаганьня паміж хаўрусьнікамі і немцамі не спыняюцца. Найболей немцы напіралі на лінію Нюпорт—Дюсмодэн, не падалёк ад Паўночнаго мора, каб прабіцца к Кале. С пачатку немцам было удалося перайці рэку Ізэр, але пасьля бэльгійцы затапілі ніжні Ізэр, і такім чынам нямецкім войскам прыйшлося атступіць. Найболей цярпела за гэты час нямецкае войска ад бомбардаваньня яго з мора англіцкімі параходамі. Якіе у гэтым мейсцы адбываліся смертаносные бітвы, можна судзіць с таго, што ў крывавых бітвах каля Остэнды немцы пераходзілі 7 раз Ізэрскі канал, але за кожным разам былі адбіты. У некаторых мейсцох каналу парабіліся масты с трупоў, па каторых немцы пробавалі пераходзіць.

---

### Вайна на моры.

На Ціхім акіяні патоплены нямецкім крэйсером «Эмдэн» расейскі крэйсер «Жемчуг». Ад крэйсера «Эмдэн» згінуло апрача расейскаго 6 параходоў. «Страхавая кампанія рэкі Янтцыкіанга» панесла мільённые шкоды ад гібелі параходоў і тавароў. Расейскі урад спыніў плаваньне на Чорным моры неваенных параходоў. Каб не аддацца у рукі праціўніка турэцкая канонерка «Буракрэпс» патапіла турэцкі-ж параход «Кіналі», а затым камандзір узарваў і самую кананерку.

---

### Вайна у паветры.

У часе бітвоў каля Варшавы з немцамі, над горадам узляцело некалькі непрыяцельскіх самалётоў, каб кідаць бомбы. За нямецкімі самалётамі падняўся расейскі аэроплан і, калі параўняўся с праціўнікамі, наш лятун стаў у іх стрэляць і папаў аднаму у твар. Пасьля гэтаго нямецкіе лятуны уцяклі. У другім мейсцы адбылася бітва у паветры паміж нямецмім і французскім лятунамі. Нямецкі лятун уцекаючы ад нападу французскаго, падняўся у гару вышэй як 2 вярсты, за ім пагнаўся французскі лятун, і ў канцы канцоў нямецкі самалёт зваліўся з лятуном з гэтай вышыні на зямлю.

---

**У Нямеччыне.** Ваенны аглядчы газэты «Popolo Romano» аблічае нямецкае войска у 9 мільёноў людзей, у тэй лічбе 5 мільёноў абу-

чэных і 4 міл. не абучэных. «Р.В.» пішуць, што страты нямецкай арміі аграмадные. Лічба раненых і забітых, напэўна, перавышае поўмільёна.

У **Турэччыне** агулам налічываецца у гэтым часе поўмільёна салдат. Распаложэна гэта войска: у раёне Смірны і ў Трацii, уздоўж каўказкай граніцы і ўзбярэжжа Чорнаго мора, ў Сырыі і Палестыне, ў Месапатаміі і ў Арабіі. Апрача гэтаго прыступлена ў цэлай Турэччыне к зграмаджэньню войска другой лініі, у агульнай лічбе 300—350 тысяч салдатоў.

У **Пэрсіі**. Турэцкі урад усімі сіламі стараецца, каб уцягнуць Пэрсію у вайну з Расеей. Пэрсідзкі урад пратэстуе проці таго, што бытцам Пэрсія зрабіла згоду с Турэччынай дзеля супольнаго выступленьня у цяперашняй вайне.

## Каля вайны.

**Калі скончыцца вайна.**

Гаворучы аб магчымасьці, што вайна працягнецца, «Русскій Інвалід» так варожыць:

«Праўдападобнай будзе такая думка, што, пакуль настане зіма, Аўстрыя будзе да рэшты разьбіта. Ваенные змаганьня проці Нямеччыны, магчыма, што да зімы ня будуць ешчэ закончэны саўсім. Вайна перакініцца цераз зіму. У сьцюдзёны зімні час ваенные змаганьня ня могуць мець жаданаго інтэсыўнаго (хутка-дзействуючаго) характэру З ранняй вясной вайна разгарыцца з быўшай сілай. Магучая нямецкая армія будзе прэдстаўляць для нас вельмі дужаго ворага, і, прачуваючы пэўную пабеду над сабою, яна будзе старанна атцягіваць гутаркі аб замірэньні. Але праз тры, чатыры месяцы усё будзе высьветлена, і толькі познай вясной ці летам, але не раней, вайна будзе закончэна. Іначэй кажучы, *цяперашняя вайна працягнецца год.* Калі-ж негадана ўсплывуць са стараны якіе-колечы важные здарэньні, каторых нельга угадаць і прыняць пад увагу, то, разумеецца, канец вайны можэ наступіць і раней ці пазьней гэтаго сроку».

У другім мейсцы, адзін прафэсар Поль Леруа-Больье, такі выказаў погляд на цяперашнюю вайну: Вайною, па яго вылічэньню, захоплена 437 мільёноў людзей з 1,700 мільёноў, што ёсьць на ўсей зямлі: Расея—171 міл., Франція 39 міл., Англія—45 міл., Бэльгія—7½ міл., Сэрбія—4½ міл., Чорнагорыя—½ міл., Японія—53½ міл., Нямеччына—66½ міл., Аўстра-Вэнгрыя—49½ міл. Да гэтаго трэба дабавіць жыхароў калёній: 12 міл.—францускай Афрыкі, 25 міл.—англіцкіх калёній, апрача Інды, 320 міл.—Індыі, 63 міл.—другіх Эўрапэйскіх калёній. Значэ вайна атклікнулася на палажэньні 857 мільёнаў людзей.

Увесь сьвет раздзеляецца на два лагеры: 116 міл. людзей аўстра-нямецкаго лагера проціў 321 мільл. людзей—нямецкіх праціўнікоў. Прадоўжнасць вайны будзе залежна ад сілы маральнаго супраціўленьня.

У прамышленнасьці ёсьцека два мейсцы, у якіх праца ідзець хутка і нячуецца недахвату у рабочых руках ні у французоў, ні ў іх ворагоў—гэта заводы і фабрыкі, дзе выробляецца аружжэ і харчэвые прыпасы. Але і тут чуецца недахват сырога матэр'ялу. Праз 4—5 месяцоў ці болей—у немцоў і аўстрыякоў, дзякуючы блокадзе (немажлівасць даставаць прадуктаў з другіх краёў), зусім ня будзе сыр'я. Вось гэта апошняе у зьвязі з асвабаджэньнем мора ад ворагоў, можэ прысьпяшыць канец вайны.

## Песьні вайны.

**IV. Разлука.**

Вецер завыў па сялібах,—
Звоніць дый звоніць па шыбах;
«Лыска» на прызьбе якочэ;
Ў хаце ў дзень сумна, як ночай.
Над сталом бацька журбуе,
Галаву звесіў сівую,
Маці у кубле штось шпырыць,
Жонка дзяцё ціхамірыць.
Янка зьбіраецца ў прочкі...
Ой, не на радасьць дні, ночкі
Сына «старая» пясьціла,
Каб рос у розум і сілу!
Ой, не на помач ў бядноце
Даў «стары» склад у рабоце,
Дый не на ўцехі вялікі
Зґралі вясельле музыкі!
Цераз палеткі, палоскі
Склік дакаціўся да вёскі,—
Клічэ на збор запаснога,
Бо на ўсім сьвеці трывога.
Новые лапці, аборы,
Новые шаты-уборы
Стаў на сябе напінаці,
Кланяцца родным і хаце.
Кланяўся нізка татулю,
А ешчэ ніжэй матулі,
Прашчаўся з жонкай, з дзіцяткам,
Сьлёзы ўціраючы ўкрадкам.
Ціха, маркотна ў сьвятліцы,
Кожны азвацца баіцца,
Якбы над імі ў спакою
Сьмерць калыхала касою.
А як «ён» с хаты выходзіў:—
«На, хай барона ў прыгодзе!»—
Гэтак матуля сказала
Дый штось на шыю ўвязала.
Матчына гэта ахвяра—
З нашых прыдбана папароў:
З роднай вузельчык кудзелькі,
Ў ім—жменька роднай зямелькі.
І выйшоў с хаты ваяка,
Не уздыхнуў, не заплакаў,
Выйшоў, зацісьнуўшы зубы,
На тые бітвы, на згубы.
Вецер адно не ўнімаўся,
Якбы варожбай займаўся:
Верніць дамоў Янка болей,
Ці ўжо ня верніць ніколі?

**Янка Купала.**

Вільня. 21/х—14 г.

## З вёскі.

«Раняны ў руку навылёт, куля пашчапала костку», — атрымаў вестку... Сэрца зайшлося ад жалю, зрабілася неяк адразу горача, цесна ў хаці. Пацягнула у поле, у лес, далей ад гэтаго лісту, што чуваць ешчэ пах крыві... Пашчапала костку!.. Нешта душыць, не дае паветру, страшэнны цяжар у ваўсім целі Ён раняны, адзежа чырвона ад крыві!... А там старэнькіе бацькі, жонка, дачушка.. Крычыць, енчыць, каб Найвышні уладарнай рукой сутрымаў тых, якіе забылі загад любіць братоў!.. І за што, Літасьціўы, гэтка пакута? Сутрымай!..

На небі ані зорачкі. Ціш, толькі часам сабака гаўкне ды сасоннік сярдзіта шуміць. Шуміць—вядзе спорку з ветрам, што крыўдзіць яго суседак—бярозак і асінак. Вецяр не вядзе ужо палюбоўных з імі жартоў, — зрывае красу, топчэ ў гразь. Бывала, першая прыкмеціць яго асіна, а потым дружнай сямейкай адгукнецца і увесь бор. Пажартуе, раскажэ усе дзівы, што бачыў у далёкім пекным краі ды далей. Дрэвы націху гамоняць пад гэтые цудоўные казкі, прыслухоўваюцца да птушачак, што звонам зьвіняць па іх галінках.

Абрываў і ўперад вецяр лісьцікі, гнуў, крышыў дрэвы, але тагды ён ваеваў з хмарамі, што мерыліся закрыць сонцэ ад іх. Задзьме, закруціць, схопіць пылу, палыхне ў хмару — яна заплачэ ад злосьці ды імчыцца далей. А цяпер яго мэта зністожыць...

Панураківае сваімі галінкамі старая бяроза, с пакорай сустрэчае сердаваньня ветру. Асіна трывожна дрыжыць, шапочэ нейкую сумную жальбу... А ён, няпрытомны, выводзіць сьпевы!.. Не, гэта енкі кананьня, праводзіны на пакуту! Гэта родна зямелька сумуе, выпраўляючы сваіх сыноў на крывавые змаганьня, гэта ад яе крыку кроў робіцца лёдам у жылах!

І ляціць думка туды, далёка, да братоў... Стрэлы, кроў, сьмерць, хмары вароньня з дзікай радасьцю глытаюць кускі чалавечаго мяса... Божухна, што гэта? Чаго не падзялілі, да чаго кіруюцца?.. Абмылка, страшэнная абмылка!.. Цешся красой, што навокал, працягвай руку таму, хто утаміўся ісьці па сьцежцы жыцьця: усім хопіць, усе будуць здаволены!..

Пачуўся першы стрэл, запахла порахам. Як адзін чэлавек пайшлі сыны Беларусі, а частка ешчэ пойдзе, з аружжэм у руках на крывавае змаганьня. З вялікім жалем выпраўляе бацькоўшчына ад працы сваіх дзетак, але і з вялікай надзеяй... Бо ня вечно панаваньне пошэсьці крывавай. Зорка шчасьлівай будучыны весела зазьяе, сонейка праўды зірне з-за цёмнай хмары!..

Многа якіх нідалічыцца, многа якіх груганы будуць валочыць косткі ды толькі капцы будуць сьведчыць, гдзе згубілі жыцьцё сыны Беларусі. Але ніхай гэты косткі будуць тым фундамантам, на якім збудуецца вяліка ўстанова ўсесьветнаго супакою. Ніхай палітая сьлязамі і крывёю зямелька дасьць буйные ўсходы, пакіраваные да жыцьцёваго красаваньня, да здабыцьця лепшай долі!

## Казкі і сны.

* * *

Вялікі, вялікі сад. Дрэвы вялікіе, высокіе, а галіны крутастые доўгіе, доўгіе. Лісьця такое шырокае, як месяц у поўні, і жоўтае, жоўтае. — Восень дыхнула на сад сваей чараўнічай сілаю і ўсё ахварбавала у прыемны ей коляр.

У садзі тым многа было красак рожных; але гэта ўжо ня былі тые прыгожые краскі, што раней,—яны вельмі баяцца прыбліжэньня чараўніцы і, каб ня быць зжоўклымі, яшчэ раней, перад тым, як мае прыйсьці яна, гэтая чараўніца-восень, краскі самі губляюць некуды сваё характво і робяцца вялымі, хворымі, як тые сухотніцы перад сьмерцю, а траўка і, так рожнае зельле, так сама сонна пазіраюць і клоняцца, клоняцца ка сну...

Лісьця бунтавалося, як відаць; шалясьцела, шэпталося, радзілося, але прыйшла ўсё-ж ткі восень і абдала іх запахам сьмерці...

Апошніе сілы свае натужывала на палову ўжо пажоўклае лісьця, баранілося ўсё, але зрывала яго сіла сьмерці за гэта і кідала, разносіла па садзі вялікім. Асабліва кляновае і асіновае лісьця, дык бэз прэстанку падала і падала, што ажно, як пуховую жоўтую пасьцельку услало пад нагамі дрэвоў сваіх, што ажно ні красак, ні зельля ніякаго відаць не было,—усё было прыкрыта жоўтым сьнегам... Жоўтае царство нейкае зрабілося, жоўтая казка. А вецер усё шалясьцеў лісьцем і баіў свае сказы... Часамі сонейка апушчало ў сад свае косы і тады усё жоўтае, яшче болей жаўцелося, прыгожым золатам адлівалося...

* * *

Я ад дзіцяці малога вельмі любіў кроў, любіў рык уміраючэй жывёлы, любіў пацеры па нябошчыку, любіў звон хоўтурны, казкі аб страшных разбойніках...

Адзін раз знайшлі у лесі забітаго чэлавека: пакалоты булавой чэрэп, паразьдзіраные пазурамі грудзі, а у баку, такая была вялізерная рана, што ажно рэбра было відаць, а кроў разьлілася лужаю па траве зялёнай і запеклася. Пажаўцела і пачырванела трава ад сораму і, мокрая ў крыві, тапырылася асобнымі сьцяблінкамі у рожные староны, як карчы пастаўленые ў верх карэньнем... Аж страшна глядзець было. Якбы гэтае мейсцэ, гэтая самая трава былі вінавайцамі, ці нават самымі тыранамі забітаго чэлавека...

Але чаму? Што вінавата трава гэтая?— Ня ведаю, — але душа мая чуе, што трава вінавата, што мейсцэ гэтае вінавата... Бо нашто гэткае мейсцэ было на гэтым мейсцы?.. На што трава на ім вырасла і цяпер, у крыві намачыўшы сябе, тапырыцца чырвоная, страшная, як рогі духа зла? Чаму? Хто дапусьціў да гэтаго?

Але добра, нехай будзе, бо я люблю гэта...

Я дрыжэў, як той ліст асінавы, калі чуў, або бачыў падобнае; у мяне гарэлі вочы, як агні, у грудзях глыбока так нешта глуха балела, што, здавалося, ці гэтая боль павінна вырвацца і імкнуць некуды ў высь да Таго, хто пазволіў ей зарадзіцца у грудзях маіх, ці я сам з ёю разам палячу...

Я люблю балючае, бо хачу, каб больш гэтай болі сабраць у грудзях маіх. Я хачу, каб яна, або занесла мяне туды... да того Бога, або, каб грудзі мае разарваліся ад ператугі...

Я люблю сьмерць. Я хачу чуць крык дзіцяці, калі яго матуля галодная сьціснье за шыйку у скасьцянелых руках сваіх...

Болей, болей страшнаго!

* * *

Пажоўклае лісьця, гэта нейначэй, як кроў. Кроў, напэўна кроў. Яна кожны год выходзіць з далёкай глыбіні зямлі, куды ўссалася за ўсе мільёны вякоў і, у глыбіні той, бытцым у грудзях маіх, яна кіпіць, варыцца, бурліць... Але раз у год яна выходзіць на верх у гэты вялікі сад і хварбуе сабою лісьця...

Я люблю жоўтае лісьця. Як сад ужо саўсім пажаўцее, я хаджу па апаўшых жоўтых лісьцях, шургаю нагамі, тапчу іх, або, лягу пад асінай на мягкім стозі жоўтых лісьцяў і гляджу, гляджу.. І вакруг жаўцізна, німа нічога апрача жаўцізны. Зямля услана жоўтым, дрэвы жоўтые..

А у грудзях маіх кіпіць, кіпіць нешта, ох, кіпіць гатуецца!!!...

Я зрываюся з мейсца і лезу на самае высокае дрэва, лезу на самую верхавіну яго; я бачу усё жоўтае. Вялікі, вялікі сад і жоўты, жоўты. Усё жоўтае. Я чую, як мая душа, мая боль у глыбіні грудзей пачынае распіраць мае грудзі, натужывае мае жылы, разгінае косьці... Г-о-о-о-х, баліць!.. Ой, як добра.. Кроў, усюдых кроў... Мне больш нічога .·. трэба. А прыдзе час, збярэцца у маіх грудзях столькі сілы, што, або грудзі разарвуцца, аях я ўімкну са ўсей больлю і злосьцю туды.бо Г-а-а-а-х!!!

* * *

Сонцэ вялікае, чырвонае, як дно найвялікшай пасудзіны, стаіць на краю сада на захадзі і пазірае праз шчыліны дрэў проста на мяне... Ціха так! Я сяджу на лаўцы і пляту

Усе енкі ніхай злучацца ды лятуць да братоў, будзяць чуласьць да свайго роднаго, прыспорываюць ды ўзмацоўваюць нашу сямейку!.. А тады, тады доля сустрэне нас, закрасуецца родна краіна ды загоіць раны..

**Зрэбны**

---

## Ліст з Ашмяншчыны.

*(Ад нашаго карэспандэнта).*

Вайна атклікнулася ўсюды—як у местох, так і па вёсках, але ня ўсюды аднолькова. Калі ў месьці, асабліва далейшым ад вайны, нічога на’т ня кідаецца ў вочы, што прыпамінала-б вайну, ды нават у самай Вільні, каторая ўжо блізка вайны і дзе гэтулькі ваенных, хоць і чуіцца блізкасьць яе, але здаецца с першаго пагляду, што жыцьцё ідзе сваім звычайным ладам. Аднолькова робюць у магазынах і канторах, аднолькова на вуліцах кожны сьпешаецца за своёй справай. Ня тое ў вёсцы, прынамсі ў нас у Ашмянскім павеці. Жывучы ў месьці здаецца, што на сяле павінна быць ціха, глуха і на’т аб вайне мала чутно. Тымчасам не. Глянце на гасьцінцы, што вядуць у Ашмяну. На дарозі як вокам сьцяміць ідуць і едуць людзі. Адны ідуць кучкамі, другіе па асобку. І з усіх гэтых людзёў вы рэдка або і зусім ня стрэнецця чалавека, каторы ішоў-бы ня с прычыны вайны. Гэта ўсё ідуць і едуць ратнікі, запасные і навабранцы, адны ў Ашмяну, другіе адтуль, з значкамі на шапках і так. Ідуць з блізку і далёку, некаторым да Ашмяны каля 19 міль (Дзерэўная). Адных ў Ашмяне азялі, другіх атпусьцілі на крыху часу, то ўзноў далі тэлеграму, назад паклікалі, задзержалі. Іншые ідуць па 10—15 міль і самі ня ведаюць, можэ прыйшоўшы дамоў дастануць тэлеграмы варочацца назад. «Але што ж, кажуць, хоць з жонкай, з дзеткамі разьвітацца, можэ апошні раз убачымся, бо, кажуць, дужа б’юцца» Іншых, каторые спазьніліся самі прыйсьці, гонюць стражнікі. Але гэткіх мала.

Працы на сяле цяпер шкодзюць страшные расказы аб вайне. Бог ведае, чаго тыкеля не кажуць, здаецца найвялікшая вобразнасьць не магла прыдумаць нічога падобнаго. Гэтак кажуць, што немцы злупліваюць скуру, дастаюць круком кішкі, адрэзаюць цыцкі ў жанок і гэт. д. Ў некаторых вёсках жыхары глядзяць, каб вечаром не было відаць на дварэ агню с хат, бо як немцы ўбачуць агонь, дык будуць кідаць с самалётоў бомбы. Можна было-б яшчэ прывясьці шмат прыкладоў, але і гэтых годзе, каб паказаць да чаго дайходзюць галасы аб вайне.

Усе і ўсюды гукаюць цяпер на сяле аб вайне, гукaнікі бываюць самые дзіўные, самые страшные.

Інтэлегент лепш гукае аб усім дзіўным, цікаўным і страшным. Ён ведае больш менш яго прычыны, ведае так сама ў прыпушчэньні і рэзультаты, а ведаючы тое і другое барждзжэй можэ перадумаць і перагаварыць. У простаго-ж чалавека, каторы не так можэ разьбірацца ў прычынах, ня ведае ў каго даведацца праўды,—ўсё дзіўное і страшнае робіцца яшчэ дзіўнейшым і страшнейшым, праўда і мана зліваюцца ў адно, старое мішаецца з новым і гуканьню німа канца. Газэтам селяне ня веруць. Тую пашану, якую яшчэ нідаўна мела ў селянаў друкаванае слова, яно ўжо цяпер ўтраціла. Кажуць на сяле, што тыкеля беларускіе газэты пішуць праўду. Але беларускіе газэты яшчэ помала пашырэны. а дзякуючы розным прычынам у некаторые мейсцы зусім не дайходзюць. дык народ і астаецца адзін з нераздуманымі думкамі, пытаньнямі.

Селяне цяпер вельмі патрабуюць рады ці аб ільгоці для запаснога або навабранца, ці ў шмат іншых патрэбах так ці інакш злучаных з вайной. Радзіцца ідуць найбольш праваслаўны да папа. каталік да ксяндза, як да адных тыкеля людзей у воласьці, каторые прынамсі ў вочы не пасьмяюцца з беднаго селяніна (я кажу аб нашым павеці, мо’ дзё і ляпей). Але першы гукае па расейску, другі па польску, дык селянін ня ўсё і разумее з іхнае рады. Гэтак мне казала адна кабеціна «Пайшла я, кажэ, парадзіцпа да ксяндза, але дзе-ж нам простым зразумець ягá гуканіку, ўсё па польску ды па польску, трэба хіба да адваката, дык вось не маю грошы.»

І ня ўжо-ж гэты гаротнік, што ідзе праліваць сваю кроў, не заслужыў таго, каб з ім гукалі у роднай зразумелай для яго мове?!.

Старшыні, каторые павінны ведаць аб ільготах і інш. справах для навабранцоў і запасных. нічога аб іх ня ведаюць. Калі ў Ашмяне на здачы воінскі казаў ім абвесьціць аб адным праве сваім воласьцям, старшыні ўставалі, стаялі проста, слухалі і, калі той канчаў гукаць, сядалі супакоіўшыся, быццам: «добра, што ўсенька ціха прайшло». І ня чуваць было пасьля, каб каторы з іх расказаў гэта паручэньне воінскаго людзём сваей воласьці. Старшыню ў воласьці нельга назваць гаспадаром, — гэта парабак, каторым, як і старастамі, загадывае пісар—шчыры гаспадар у воласьці.

Тое, што перашкаджае селяніну зразумець папа ці ксендза, тое самае ёсьць перашкодэй і ў воласьці. Усе загады для старастоў і абвесткі (а цяпер тых і другіх асабліва шмат) пішуцца па расейску. А дзеля таго, што старасты па расейску не разумеюць, ім с пачатку пісар выясьняе па беларуску. Але і так бывае шмат сьмешнаго і смутнаго. Напрыклад, штось каля 14 кастрычніка быў дадзены старастам загад, каб селяне прывялі ў мястэчка коні, бо будуць браць на вайну. У загадзі было напісана, што калі хто цяпер каня затоіць, ня прывядзе, ў таго яго вазмуць дарма. Гэтае дарма (безплатно) было надрукавано буйнымі літарамі. У аднэй вёсцы селяне зразумелі, што ў іх коні будуць браць дарма. І пайшлі галасы, страх і вык: «Да чагаж мы дажыліся, да ўжо-ж коні адбіраць будуць!» Цікаўна, што гэтак жэ зразумеў загад нават шмат хто ў Ашмяне, дзе звычайные мешчане мала ўмеюць па расейску.

Цяпер на сяле правюць усюды дарогі (перш, дык мала аб іх рупіліся). Да дарогі тыкеля загадываюць селянам. Правюць ня кожны проціў свайго поля, але бывае на вёрст 7—10 ад сялібы, тымчасам проці сялібы такога гаспадара правіць хто іншы, таксама здалёку. Слупоў тэлеграфных, мастоў (на’т невялічкіх) і розных трубаў ля дарогі, дзеля сьцяканьня вады, пілнуюць узноў тыкеля селяне. дваранам, не кажучы ўжо аб панох, не загадываюць. Гэткіе прывілеі дваранам, апрача таго, што несправядлівы, вельмі шкодзюць так патрэбнай, асабліва ў цяперашнім часе, згодзі ўсіх станоў нашаго краю. Дваранін маючы прывілеі добра ведае, што яму лепш быць дваранінам і ня хочэ злучацца с селянінам,—глядзіць на яго, як на кагось горшаго, каторы мусіць шмат таго робіць, ад чаго ён, дваранін, вольны. А селянін ізноў касавурыцца на двараніна, і гэткім чынам вытвараіцца між людзьмі аднэй нацiі і старонкі непатрэбная ненавісьць.

**Янка Станкеўчык.**

---

## З Беларусі і Літвы.

### З Віленшчыны.

**Абавязковая пастанова,** забараняючая вывазіць с кожнай губ., належачых да Мінскаго і двінскаго ваеннаго округоў, муку, збожа і жывёлу, адменяецца. На далей забараняецца вывозіць муку, збожэ і жывёлы агульна за межы двінскаго ваеннаго округу. Віноўные ў невыпаўненьні гэтай пастановы будуць карацца адміністраціўна да 3000 р. штрафу або да 3 мес. арышту у турме ці крэпасьці.

**Петраградзкі час.** Глаўны начальнік двінскаго ваеннаго округу загадаў, каб ва ўсіх грамадзянскіх (не ваенных) установах Віленскай губ. гадзіны працы лічыліся павэдлуг Петраградзкаго ча-

---

з апаўшых лісьцяў вянок для маей каханкі... Не, у мяне німа яе, але я, заўсёды думаю аб ёй, заўсёды сьню аб ёй. Ня ведаю чаму?—Яна такая прыгожая, такая гібкая, такая вясёлая! Яе сьмех, здаецца я чуў не раз. Яна сьмяецца так едка, так, калюча—горка сьмяецца яна. Часамі яна бывае сур’ёзнай, і я прызнаю, што яна час ад часу мае права быць такой. Яна мне вельмі падабаецца. Яна ў мяне прасіла зрабіць для яе вянок з апаўшых лісьцяў, толькі с самых жоўценькіх лісьцяў. Кажэ: «Я вельмі люблю кроў...»—Што-ж,—я зраблю, нехай сабе,—але ведаю добра, што для яе гэта толькі так сабе...

* * *

За цэлы дзень я вельмі змарыўся: я закалоў парсюка, зарэзаў курыцу, спаліў два мурашнікі, што у садзе каля хаты завяліся, цяпер я прыйшоў да хаты с хаўтуроў стрэчнаго брата... Чыталі, чыталі, званілі, званілі,—аж у мазгох гудзіць нешта. Змарыўся саўсім. —Прынясі мне, Тодар, лісьцяў с саду, на лісьцях буду спаць сягоньня...

* * *

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . Ха! хто гэта казаў, што высака? — саўсім ня высака, вельмі добра; шкада, што выжэй нема як залезьці, бо дрэво выжэй ня вырасло...

Што гэта неяк лёгка мне, лёгка, як у сьне якім? І сам я такі лёганькі!.. А гдзе гэта думкі мае? Што гэта вы расплыліся гэтак, бытцым хмары пасьля дожджыку. Расплыліся, расплыліся...

Во тутака добра, тутака ў самы раз, я на гэтай галінцы сяду, — жучка гэтаго скінуць можна, што ён тут дарма перэшкаджаць будзе!.. Або, чэкай,—ляпей вось на тым лісточку прымашчуся,—ён такі харошэнькі... Ляпей на тым лісточку.. Лёгка, так лёгка... Ён найболей жоўты ад ўсіх тут, найболей крыві... ён аж чырванее неяк...

Вось дык дзіва,— чаму ж я раней не бачыў? Як яно, тое мейсцэ ў маім садзе апынулася? шакш у лесі того чэлавека знайшлі!?.. Але якая гэтая трава вялікая вырасла.. А кроў на ей, дык грудамі, грудамі проста... а тапырыцца як! Як чортавы рогі! Ха! так і трэба, так і трэба... А ці ён не пачаў гнісьці? Гэ, куды там! Саўсім сьвежынькі, — дзіра ў боку, дык ані воднай мухі, усё як мае быць, толькі пáра перастала ісьці, — пахаладзеў... А бельмы як жывы тарошчыць... Так, так..

Так лёгка, лёгка, сонна так...

На што мне на гэтым лісьце здалося вісець? — вазьму, дый паплыву сабе над садам у паветры... Цёпла так!.. Паплыву... І вышэй магу. Вось чуць-чуць віднеіцца зямля. Высока ляпей, паплыву яшчэ туды, выжэй. Гэ, на мысль прыйшло: па дарозі зайсьціся можна да Яго і пагаварыць. Боль паказаць Яму, паказаць усё.. Што?! — Боль. — Якую? Гдзе?!—Гдзе?—т...та... у садзі там, бачыце, трава... Хы! Якую я яму буду траву паказываць? нейкую сьмешную чырвоную траву... Здурэў?.. Паплыву сабе лепей на захад—там прыгажэй... Не, над садам лепей...

Ой дзяўчына мая люба, стройна, павабна там гуляе!..

Во-во-во-во! А гібкая, лагодная. Цела яе такое цёплае... Ідзе, бачыш, ідзе і сьмяецца, чараўніца мая, сьмяецца... Трэба ніжэй спусьціцца, во гэтак.

Га, яна-ж мяне пазнае! Яна мая думка, мая душа, маё сэрцэ, мая кроў... Яна пазнае мяне, мая дзяўчына —, а я-ж цябе так даўно чэкаў. Якая ты прыгожая! Хадзі да мяне. Ну, подыйміся-ж і ляці да мяне, — тут над садам так добра! Я пакажу табе усё сваё уладарнае багацьце. Плыві да мяне, мая люба!. Чаму? Чаму ня хочэш? я-ж табе саўсім не прыказваў,—чаго-ж ты зазлавалася? Плачэш!? О Божухна! Не плач, ну, ня злуй, выбачай, найдаражэйшая, што я не падумаўшы сказаў табе; я, я павінен першым падыйсьці да цябе, праўда? О! ты ня хочэш даравацъ... Глядзі, я ўжо тут, на зямлі, я ўжо спусьціўся, — пазволь мне паўзьці да цябе, позволь мне... Што? Ты ня можэш даравацъ мне. Праўда я вельмі вінават, я больш ня буду такім, не, не. Глядзі, я на каленьнях прашу цябе, глядзі, я тварам сваім прыхіліўся да зямлі і змочыў яе, як ліўнем дажджу, сьлязьмі сваімі. Даруй мне, даруй.

Вянок?!

Ты зазлавалася за вянок з жоўтых лісьцяў?.. Выбачай, выбачай, мая дарагая, — гэта быў прост неабдуманы жарт..

О, ты усьмехаешся! За адну усьмешку тваю я аддам поўжыцьця свайго, а за пацалунак твой я цэлае жыцьцё аддам...

Я сад аддам табе, гэты прыгожы, «зялёны» сад!..

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Дзяўчына падыйшла і пацалавала яго у самые вусны

А пажоўклае лісьця было мокрае ад сьлёз.

**Піліпоў.**

Вільня 28/9 14

су. Дагэтуль у Віленшчыне ужываўся мейсцовы час.

**На «Чырвоны Крыж»** у Вільне сабралі 28 верэсьня 6179 р.

**«Казёнкі».** Як пішэ «Веч. Газ.» з 280 манаполек, нахадзячыхся у Віл. губ., закрыта да гэтаго часу 120. З іх меньшая палавіна закрыта па прыгаворах сельскіх сходоў, а большая частка - акцызным доглядам. Цяперака большая часьць прадаўцоў (сядзельцоў) разлічэны і лічуцца за штатам. Так сама разлічэны усе зборшчыкі грошы з манаполек.

**«Палітурные бравaркі»** недаўна высачэны акцызным доглядам у вёсцэ Каплічніках, рэшанск. воласьці, ашмянск. пав., у хаце селянкі Купцэвіч і ў вёсцэ Пусталоўцэ, тэй-жэ воласьці, ў хаце селянкі Буйноўскай. У гэтых браваркох выганялі гарэлку с палітуры. Абедзьве справы перэдадзены у судовые установы.

**Пажары.** У фальварку Паўлокая, даўгеліскай вол., сьвенцянск. пав.. згарэло гумно і хата селяніна І. Арамовіча; страты каля 2000 руб.; прычына: с помсты патпаліла дзяўчынка 13-ці год А. Пілeніс. — У вёсцэ Паказні-Татарскай, ліпшынск. вол., ушмянск. пав., выгарэло 12 будынін 5-ці селян-гаспадароў; страты болей як на 3000 р. — У вёсцэ Зарэччэ, лідзкай вол. і пав., выгарэлі будоўлі селяніна Шынкевіча і арэндатара Клінцэвіча; апошняму пажар зрабіў страты каля 5000 руб. У вёсцэ Падалянцах, эйшыскай вол., ашмянск. пав., памешаны А. Верэшка 60-ці год, спаліў лазьню, належачую да Александра Верэшко; пасьля гэтаго памешаны А. Верэшка павесіўся.

**Нешчасьці.** У дварэ «Новы-Двор», сольск. вол., ашмянск. пав., К. Качана, у часе маладзьбы, праз неўвагу папаў у кола малатарні хлапец Л. Дрэма, і забіўся на сьмерць.—У м-ку Крэво, крэўскай вол., ашмянск. пав., капаючы яму засыпаўся пяском селянін І. Жукоўскі, выцягнулі яго з ямы ужо нежывым.—У дварэ Лебеда, забалотнай вол., лідзк. пав., чысьцючы студню, забіўся праз неўвагу на сьмерць вочэпам селянін А. Хрышчановіч. — На станціі у Вільні узарваўся пры пакаваньні у вагон клумек з багажом і заняўся пажар, ад якога моцна абгарэў кандуктар Ліхтаровіч і ўшкодзіла 11 штук багажу; пажар спынілі пры помачы паравозу. Следзтва аб прычыне ўзрыву ідзе.

**Продаж дэнатураванаго спірту.** Ад Упраўляючага акцызнымі зборамі Віленск. губ. п. Л. Андэрсона рэдакція атрымала паведамленьне, с просьбай надрукаваць у «Н. Н.» абвестку, у якіх мейсцох Віленск. губ. аткрыты манапольки для продажы дэнатураванаго (не прыгоднаго для піцьця) спірту. Спірт гэты ужываецца толькі на апал і асьвятленьне і прадаецца толькі тым, хто мае на гэта асабліваe пазваленьне ад акцызу. Манапольки адно з гэтым спіртам атчынены у Вільні: на Юраўскім пр., Зарэчнай вул., Вялікай Пагулянцэ, Пірамонцкім пер., Антокольск. вул., Завальнай вул. і ў Звярынцы (ад 9 да 11 гадзіны раніцы і ад 4 да 6 веч.). У іншых гарадох: у Нова-Вілейску, Ашмянах, Сьвенцянах, Троках, Дзісне, Друі, Лідзе, Смаргонях, Вілейцэ. Радашковічах (ад 9 да 12 гадзіны дня). У мястэчках: Глыбокім, Маладэчыне, Аранах, Нова-Сьвенцянах, Паставах, Васілішках, Шчучыне, Эйшышках, Свіры, Падбродзьдзі, Шырвінтах, і Даўгінаве (ад 1 да 3 гадзіны дня). У сьвяты і табэлі манапольки закрыты.

## З Міншчыны.

**Помач селяноў ваякам.** У Мінск прывязьлі селяне з навагрудзкаго пав. на 43 фурманках палатно, тканіну і бялізну для раненых. Кажуць, што і ў іншых паветах мінск. губ. так сама зьбіраюць селяне бялізну для раненых.

**Для сем'яў запасных** валаджэна у Мінску 21 кастрычніка продаж значкоў з гэрбам горада Мінска. Увесь даход з гэтай продажы пойдзе на карысьць мінскаго гарадзкога камітэту грамадзянскай помачы сем'ям запасных і ратнікоў апалчэньня.

**Штрафы.** За пераховываньне без пазваленьня 3 рэвальвэроў і 4 стрэльбоў аштрафованы мінскім губэрнатаром на 3000 р. або 3 месяцы адседкі у крэпасьці барон А. фон-Майдэль. - За патайную таргоўлю гарэлкай засаджэны пад арышт на 3 месяцы кожны 5 пінскіх жыхароў.—Жыхары м-ка Новай-Мышы, новагрудзк. пав, В. Кабіцкі, І. Турэвіч і В. Барысовіч засаджэны пад арышт па 2 тыдні кожны за тое, што самавольна пакінулі вартаваньне мосту на Палеск. чыгунцэ.

**Памёр ад гарэлкі акцызнік** Л. Дрэгер у пінскім павеце. Дрэгер выехаў з м-ка Століна на участак. У сяле Рачыцы ён з манапольки № 271 загадаў вынесьці спірт на павозку. Па дарозе ён аткрыў скрынку і пачаў выпіваць, і так выпіў, што ўзяў і памёр.

# З усіх старон.

**Ваенные школы.** Дзеля сьпешнай падгатоўкі для арміі афіцэроў аткрываюцца ваенные школы: 4 ў Петраградзе і па адной—у Маскве і Кіеве. Кожная школа разлічэна на 200 вучнёў. У школу прыймаюцца без экзаменоў вольнапрадзеляючые 1-го разраду і ніжніе чыны, што ў войску, с правам па навуках ня меней 2-га разраду а такжэ са стараны (ня служачые ў войску) маладые людзі, якіе маюць права паступіць у войска вольнаапрэдзеляючымі 1-го разраду або ахотнікамі (дабравольцамі) па навуках не ніжэй 2-го разраду. Прынятые у школы са стараны лічуцца на дзействіцельнай ваеннай службе. Вучні, прызнаные камісіей добра акончыўшымі курс школы, атрымліваюць чыны прапоршчыкоў.

Каб даць магчымасьць большай лічбе маладых людзей паступіць у нова аткрываные афіцэрскіе школы, урад ізноў пазволіў трымаць экзаміны на вольноопрэделяючых 2-го разраду.

**«Патронаты».** Урад пазволіў аддзельным асобам, грамадзянскім установам, дабрачынным хаўрусам і інш. прыймаць пад сваю апеку, догляд і харчэваньне раненых і хворых ваякоў (як ніжніх чыноў так і афіцэроў), якіе прызнаны саўсім непрыгоднымі да ваеннай службы с прычыны свайго нездароўя. Пазваленьня на аткрыцьце патронатоў выдаюцца губэрнатарамі.

У **сем'і запасных,** якіе хочуць карыстаць з дармавога праезду па чыгунцэ, залічаюцца толькі жонка, матка, незамужніе дочкі і непоўнагодніе сыны; свядоцтвы на праезд могуць выдаваць толькі губэрнатары, градоначальнікі, земскіе папечыцельствы, земскіе начальнікі, камэнданты крэпасьцей. Паездка можэ адбывацца толькі адзін раз.

Вучні **вучыцельскіх сэмінар'еў і школаў** могуць атрымліваць да 22-годняго узросту атсрочку для адбываньня ваеннай павіннасьці, павінны толькі загадзя аб гэтым хлапатаць перэд ваенным начальствам.

**Звальняюцца ад платы за навуку** на час вайны дзеці, бацькі каторых пакліканы у войска, ва ўсіх вучыцельскіх інстытутах, вышэйшых, срэдніх і вышэйшых начальных школах апрача студэнтоў Варшаўскаго унівэрсытэту, Лекарэўскаго інстытуту і вэтэрынарных інстытутоў.

**Пісьмы і пасылкі ваеннапалонным.** Агенство ваеннапалонных міжнароднаго камітэту «Чырвонаго Крыжа» у Жэневе (у Швэйцарыі) паведамляе, што бэзпасрэдняя караспандэнція—пісьмы і пасылкі—паміж ваенна-палоннымі і іх сем'ямі ужо пазволена. Пасылкі павінны быць абазначэны «Service des prison niers de guerre», а пісьмы не павінны мець у сабе нічога, апрача вестак асабістаго характэтару і павінны быць аткрытымі; пераводы з грашыма можна адрэсаваць так: «Controle général des postes» у Бэрне—Швэйцарыя, для такога... Адрэс агенства такі: «Agence de la Croix Rouge pour la registration de prisoniers de guerre Geneve—Suisse».

**28 мільёноў на раненых.** Маскоўская управа зацьвердзіла смету расходоў для нясеньня помачы раненым у Маскве у суме каля 28 мільёноў руб. Казна дае на гэта каля 24 мільёноў руб.

**На патрэбы вайны.** Урад пазволіў сельскім обчэствам выдаваць па прыгаворах сельскіх сходоў падмогі на патрэбы вайны з валасных абчэственных грошэй і з збожэвых сапасных магазыноў, але ня болей аднэй пятай часьці з усяго капіталу і запасу і з варункам, што сельскіе обчэствы папоўнюць гэтые капіталы і запасы ў размеры выдадзенай падмогі.

**Законапраекты.** У савет міністроў уносіцца праект закону, па якому кожны, хто выежджае з Расеі за граніцу, не залежна ад яго падданства, можэ вывазіць с сабою ня болей як 500 р., усё роўна—золатам ці бумажкамі. Гэта дзеле таго, каб не вывозіліся за граніцу лішніе грошы. Хто захочэ без пазваленьня правесьці большую суму — таго будуць цягнуць пад угалоўны суд

Міністэрство дарог маніцца саўсім скасаваць «ручны» багаж, так што у вагон ня можна будзе нічога с сабой браць, а трэба будзе здаваць у багаж.

**Новые маркі.** Апрацованы ужо праекты новых марак. На марках ад 1—7 к. будзе адбіта сымволічная фігура Расеі, на марках ад 7 да 70 к. - уселякіе способы перавозу почты, на марках 1, 2, 3 і 5 руб.—від Крэмлю, Зімняго Дварца, Дому Раманавых і Ігнатоўскаго манастыру.

**З Амэрыкі у Архангельск** прыйшоў нараход «Двінск», на якім прыехала 1400 людзей вернуўшыхся з Амэрыкі у Расею.

У **Севастопалі** пад штрафам да 3000 р. або арышту да 3 месяцоў забаронено жыхарам запаліваць з вечэра і ў ночы агні у сябе дома, калі з іх хат відаць аткрытае морэ, так сама забаронена і на вуліцах паліць агні, якіе могуць быць відны з мора і памагаць непрыяцелю разьбірацца ў месцасьці.

У Польшы. Гасудар Імпэратар ахвяраваў с сваіх грошы 200,000 руб. для жыхороў Польшчы, пацярпеўшых с прычыны вайны. — У «Арм. Вѣстн.» надруковано, што Верхоўным Главнакамандуючым пазволена зладжываць польскіе легіоны для вяйны з немцамі. У легіоны прыймаюцца толькі палякі-католікі, не маладзей 18-ці год, і ня быўшые пад судом. Паміж іншым у легіонах будзе завецзена польская каманда. — На уліцах Варшавы расклеена такая абвестка: «Па загаду камандуючаго арміей абвешчаю, што за псаваньне тэлеграфных і тэлефонных ліній віноўные будуць растрэлівацца бяз суду». Дэпутат Наконечны, апісываючы поле бітвы у люблінскай губ., кажэ, што аж дух затыкае ад трупяго смуроду; праежджаючы у колькі дзён пасьля бітвоў удоўж пабоішча, бачыў сотні чэлавечых і быдлячых трупоў, гніючых на аткрытым паветры.

У **Галіччыне.** «Прыкарпацкая Русь». звертаючы увагу, што у Львове, а такжа у рэшце гарадоў Галіччыны закрыты усе украінскіе школы, даець раду не адцягіваючы заняцца наладжэньнем у Галіччыне расейскай школы, пачынаючы ад народнай і кончучы вышэйшымі вучэльнямі.—«Веч Вр.» пішэ, што на вуліцах Львова што раз часьцей паяўляюцца расейскіе чыноўніцкіе шапкі. Пааткрываліся ўжо новые расейскіе крамы. Расейскіе грошы зусім выпіраюць аўстрыяцкіе.—У Львове наладжэна аддзел Петроградзкаго Тэлеграфнаго Агенства.

Рэдактар-Выдавец
**І. Луцэвіч.**

**Прыймаецца далей падпіска на „Нашу Ніву“ на 1914 г.**

Цэна на год—2 р. 50 кап., на 9 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.—65 к., на 1 мес.—25 кап.

*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

**Усякую гаспадарскую прыладу:**

**сечкарні,**
**малацарні,**
**манежы,**
**шарпакі,**
**арфы**

**СУЛІЦЬ**

**Склад Віленскаго Таварыства Сельскай Гаспадаркі.**

*Вільня, Завальная № 9.*

**Тавару вялікі выбар.**

Друкарня Марціна Кухты, Татарская 20.